# [Ляліна „калекцыя“]

Сёньня пад вечар мы з дзецьмі хадзілі гуляць. Праходзячы лесам, меньшая дочка, шукаючы ягад, угледзела коніка і ня мінула, каб не злавіць яго, а злавіўшы, не пахваліцца: „Мама, тата, глядзеце, які конік!“ „Нашто ён табе?“, — ёй сказалі. „Для калекцыі“, — адказала, разглядаючы яго крыльцы, ножкі і рэшту частак яго цельца, зашчымленага ў пальцах маленькай ручкі. Праз нейкі час яна зноў падбегла да нас. „Тата, паглядзі, якія ў яго крыльцы, зьверху, бачыш, шэрыя, а пад нізом вось якія чырвоныя“, — і адвярнула ў коніка верхняе крыльца, каб паказаць чырвонае за шэрым. З тым жа перабегла яна й да мамы. І калі тая сказала: „...ды кінь ты яго, ня муч“, — адказала: „Ого, гэта для калекцыі“, — і далей разглядвала коніка, соваючы яму ў рот саломку, рась[цяг]ваючы яму жывот і паказваючы, як то таньчэе, то таўсьцее. І гэта забыла ягады. У яе душы цяпер [на] увазе быў конік. Другая, большая дочка, зьбірала ягады і такжа кожную прыносіла тату ці маме ды паказвала, якую ягаду яна знайшла. І былі гэтыя і ягады, і конік, і лес гэты іх радасьцю знаходак. Калі ж, прысеўшы на пралесцы, каб даць адпачнуць нагам, запыталі, як ты [навучылася] іх лавіць, расказала. „От быццам тут няма коніка, а тут ёсьць. Я ціхенька так падыходжу і так хоп яго з травою“, — і тут жа яна ўсё гэта паказвала, каб было гэта ўідней і ясьней. Яна прынесла коніка дадому. Дома засадзіла яго ў скрыначку, палажыла яму нейкі лісток, а сама легла спаць. І як соладка спала яна, ня чуючы, як біўся цалюткую ноч у скрынцы конік, і як рваўся ён выбіцца з яе туды, дзе расла трава і дзе кветкі цьвілі!

Думаў я —

...У пакутах і сьмерці... казюляк тварылася Ляліна „калекцыя“...

*[1932]*